ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў"
____________ А.А. Корбут
"3" 01 2019

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб адкрытым конкурсе харавых апрацовак беларускіх народных песень

МІНСК 2019

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае Палажэнне аб адкрытым конкурсе харавых апрацовак беларускіх народных песень (далей – Палажэнне) акрэслівае парадак арганізацыі і правядзення Адкрытага конкурсу харавых апрацовак беларускіх народных песень (далей – конкурс).

1.2. Мэты конкурсу:

- папулярызацыя беларускай народнай песні і пашырэнне яе мастацкіх межаў у кантэксце сучаснай музычнай культуры;
- умацаванне і развіццё традыцый айчыннай харавой культуры;
- падтрымка і заахвочванне маладых выканаўцаў беларускіх народных песень да творчай працы з фальклорам;
- адкрыццё новых імёнаў і сучасных харавых твораў у галіне харавой апрацоўкі беларускіх народных песень;
- выданне рэпертуарнага зборніка харавых твораў фіналістаў і пераможцаў конкурсу для выкарыстання ў канцэртнай і педагагічнай дзейнасці каледжаў і УВА;
- прафарыентацыйная работа з навучэнцамі дзіцячых музычных школ мастацтваў, музычных каледжаў і каледжаў мастацтваў.

1.3. Заснавальнікі конкурсу:

- установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” кафедра беларускай народна-песеннай творчасці;
- асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў пры Грамадскай арганізацыі “Беларускі саюз музычных дзеячаў”.

1.4. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца вучні і настаўнікі дзіцячых музычных школ мастацтваў; навучэнцы і выкладчыкі музычных каледжаў і каледжаў мастацтваў; студэнты, магістранты, аспіранты і выкладчыкі УВА; самадзейныя кампазітары. **Удзел у конкурсе прафесійных кампазітараў забаронены.** Конкурс **не мае ўзроставых абмежаванняў.**

1.5. Заснавальнікі конкурсу набываюць права выкарыстоўваць прадстаўленыя на конкурс творы ў сваёй выдавецкай, канцэртнай і педагагічнай дзейнасці без згоды ўдзельнікаў конкурсу і выплаты аўтарскага ганарару. Аўтарскія правы захоўваюцца за аўтарам.

1.6. Усе матэрыялы (фатаграфічныя выявы, аудыё- і выдэазапісы, партытуры), атрыманыя заснавальнікамі конкурсу ад канкурсантаў, правы на дадзеныя матэрыялы належаць заснавальнікам конкурсу і выкарыстоўваюцца ў межах мерапрыемстваў па яго арганізацыі і правядзенню без згоды ўдзельнікаў і выплаты аўтарскага ганарару за іх выкарыстанне.

## 2. УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

2.1. Конкурс складаецца з **двух тураў:**

**Першы тур** з'яўляецца завочным і праводзіцца 15.03.2019 года ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў". Па выніках першага тура журы вызначае **6 фіналістаў**.

**Другі тур** з'яўляецца вочным і праходзіць у форме публічнага выканання твораў фіналістаў творчымі калектывамі кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" у маі 2019 года.

У выпадку змены даты і месца правядзення конкурсу заснавальнікі і арганізатары будуць паведамляць усім зацікаўленым праз інфармацыйныя рэсурсы.

2.2. Для ўдзелу ў конкурсе ўдзельнік прадстаўляе ў арганізацыйны камітэт канверт з наступнымі матэрыяламі:

- заяўку на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам I да дадзенага Палажэння;
- партытуру твора (твораў), якая адпавядае патрабаванням, акрэсленым у падпункце 2.4 дадзенага Палажэння, на папяровым носьбіце ў 2 (двух) экзэмплярах і, па жаданні ўдзельніка, аўдыязапіс твора на CD. Партытура (партытуры) павінны знаходзіцца ў асобным канверце, на якім будзе пазначаны толькі псеўданім (дэвіз) удзельніка.

Спосабы падачы матэрыялаў:

а) даслаць па пошце на адрас: ***Рэспубліка Беларусь, 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17*** з пазнакай "У арганізацыйны камітэт конкурсу харавых апрацовак, пак. 828".

б) прынесці асабіста ці перадаць па адрасе: ***г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, кафедра беларускай народна-песеннай творчасці, паверх 8, каб. 828, лабаранту.***

Унутры канверта павінны змяшчацца:

а) канверт з партытурай (партытурамі) твора (твораў) у 2 (двух) экзэмплярах. Канверт пазначаецца толькі псеўданімам (дэвізам);

б) CD з магчымым аудыязапісам;

в) заяўка.

**Апошні дзень паступлення матэрыялаў у арганізацыйны камітэт 05.03.2019.**

2.3. Конкурс праводзіцца па адной **намінацыі:** ***апрацоўка беларускай народнай песні для змешанага ці жаночага народнага хору альбо ансамбля.***

2.4.**Патрабаванні да конкурсных партытур**:

У конкурсе ўдзельнічаюць харавыя партытуры, створаныя на аснове беларускіх народных песень (адной ці некалькіх).

Дапускаюцца творы **a cappella** ці з **суправаджэннем.** Акампанімент прапісваецца ў патытуры. Дапускаюцца фанаграмы "–", створаныя на падставе запісу акустычных інструментаў, а таксама сродкамі камп'ютарнай аранжыроўкі. Тэхнічная якасць фанаграм павінна быць высокай і адпавядаць канцэртнаму выступу. **Фанаграма** дасылаецца разам з партытурай аудыяфайлам фармата MP3, WAVE (на CD).

Дазваляецца выкарыстанне адрэдактаванага **паэтычнага тэксту** песні (песень): скарачэнне, кампіляцыя і г.д.

Ступень складанасці твора павінна адпавядаць сучасным магчымасцям вучэбных калектываў кафедры беларускай народна-песеннай творчасці:

- падзел жаночай групы не больш чым на 5 галасоў;
- падзел мужчынскай групы не больш чым на 2 голасы;
- **дыяпазон жаночай групы**: **g** малой актавы – **c** другой;
- **дыяпазон мужчынскай групы**: **c** малой актавы – **f** першай;

Кожны ўдзельнік мае магчымасць прадставіць на конкурс 1-3 харавыя партытуры.

Час гучання кожнага твору не павінен перавышаць **5 хвілін**.

**Дапускаюцца творы, якія раней не публікаваліся.**

Творы павінны быць прадстаўлены ў **рукапісным або набраным на камп'ютары і раздрукаваным выглядзе**. Партытуры, напісаныя неразборліва, або з грубымі парушэннямі правіл запісу музыкі не будуць разглядацца журы.

2.5. Матэрыялы, якія не адпавядаюць патрабаванням, акрэсленым у падпунктах 2.2, 2.3, 2.4 дадзенага Палажэння, да разляду не прымаюцца. Матэрыялы, прадстаўленыя на конкурс, удзельнікам не вяртаюцца.

## 3. **АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ І ЖУРЫ КОНКУРСУ**

3.1. У склад аргкамітэту ўваходзяць кампетэнтныя спецыялісты УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў". Склад аргкамітэту зацвярджаецца заснавальнікамі конкурсу.

3.2. **Абавязкі аргкамітэту:**

– ажыццяўляць кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем конкурсу;

– зацвярджаць склад журы конкурсу;

– ажыццяўляць ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі юрыдычнымі асобамі па пытаннях арганізацыі і правядзення конкурсу і яго асвятленню ў СМІ;

– інфармаваць канкурсантаў аб выніках іх удзелу ў конкурсе;

– вырашаць іншыя пытанні па правядзенню конкурсу.

У мэтах ацэнкі твораў канкурсантаў аргкамітэтам зацвярджаецца склад журы конкурсу (не менш чым за 5 чалавек).

Склад журы фарміруецца з ліку педагагічных работнікаў устаноў адукацыі, творчых работнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь.

3.3 **Абавязкі журы:**

– займацца ацэнкай твораў канкурсантаў;

– афармляць пратаколы вынікаў ацэнкі твораў канкурсантаў;

– вызначаць пераможцаў, уладальнікаў спецыяльных узнагарод і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджання.

Рашэнні журы прымаюцца на пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі. Рашэнні журы з'яўляюцца канчатковымі і не падлягаюць перагляду.

## 4. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ КОНКУРСНЫХ ТВОРАЎ. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

4.1 Журы ацэньвае творы канкурсантаў, абапіраючыся на наступныя крытэрыі:

– улік аўтарам спецыфікі выразных і выканальніцкіх сродкаў народнага хору, ансамбля;

– ступень творчай арыгінальнасці і стылявой індывідуальнасці твора;

– узровень валодання прыёмамі харавой аранжыроўкі, тэхнікамі кампазітарскага пісьма.

4.2. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца журы адкрытым галасаваннем персанальна па кожнаму твору.

4.3. Інфармацыя аб выніках конкурсу размяшчаецца на сайтах заснавальнікаў і арганізатараў.

4.4 У апошні дзень конкурсу (фінал) праводзіцца ўзнагароджанне пераможцаў.

4.5. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата I, II і III ступені, сімвалічнымі каштоўнымі падарункамі.

4.6. Рашэннем журы могуць быць вызначаны спецыяльныя ўзнагароды ад заснавальнікаў конкурсу.

## 5. ФІНАНСАВАННЕ КОНКУРСУ

5.1. Фінансаванне расходаў на праезд, пражыванне і харчаванне канкурсантаў, дапушчаных да II тура конкурсу, ажыццяўляецца канкурсантамі самастойна ці за кошт накіроўваючага боку.

**ДАДАТАК I**
да Палажэння аб
адкрытым конкурсе
харавых апрацовак
беларускіх народных песень

Заяўка
на ўдзел у адкрытым конкурсе харавых апрацовак
беларускіх народных песень

1. Прозвішча________________________________________________
2. Імя______________________________________________________
3. Імя па бацьку_____________________________________________
4. Дата нараджэння___________________________________________
5. Назва і адрас установы адукацыі, арганіацыі, у якой канкурсант навучаецца або працуе______________________________________________
_________________________________________________________________
6. Адрас пражывання_________________________________________
7. Тэлефон, факс____________________________________________
8. Дэвіз (псеўданім), пад якім прадстаўляецца на конкурс твор канкурсанта_______________________________________________
9. Творчыя дасягненні (калі маюцца)_________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________

______________________________ (подпіс канкурсанта ці яго законнага прадстаўніка)

______________________ (ініцыялы, прозвішча)

__________ (дата)